# АБ ЗАДАЧАХ ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ І СПОРТУ Ў РЭСПУБЛІЦЫ Ў СВЯТЛЕ РАШЭННЯЎ XXIV З'ЕЗДА КПСС

## *Даклад другога сакратара ЦК КП Беларусі таварыша А. Н. АКСЁНАВА на нарадзе партыйна-гаспадарчага актыву рэспублікі 13 мая 1972 года*

Таварышы! Поўны творчых сіл і рэвалюцыйнага энтузіязму ідзе савецкі народ насустрач свайму слаўнаму і радаснаму святу — 50-годдзю Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Ахопленыя пафасам стварэння, савецкія людзі паспяхова ажыццяўляюць выпрацаваную XXIV з'ездам КПСС праграму камуністычнага будаўніцтва. У гэтым вялікім паходзе пуцяводным компасам для нашай партыі, для кожнага савецкага чалавека служаць неўміручыя ленінскія запаветы.

Будаўніцтва камунізму, вучыў Уладзімір Ільіч Ленін, трэба разглядаць як комплексную задачу, у якой вырашэнне эканамічных і сацыяльна-палітычных праблем арганічна звязана з фарміраваннем новага чалавека, з выхаваннем, навучаннем «усебакова развітых і ўсебакова падрыхтаваных людзей». Гэта азначае, што чым вышэйшая свядомасць, ідэйная перакананасць членаў нашага грамадства, тым паўней і шырэй разгортваецца іх сацыяльная актыўнасць, тым хутчэй і больш паспяхова вырашаюцца практычныя задачы камуністычнага будаўніцтва.

Камуністычная партыя, савецкая дзяржава ажыццяўляюць праграму выхавання і фарміравання чалавека камуністычнай фармацыі, які гарманічна спалучае ў сабе навуковы светапогляд, маральную чыстату і фізічную дасканаласць; праяўляе пастаянныя і ўсё ўзрастаючыя клопаты аб паляпшэнні ўмоў для ўсебаковага развіцця асобы савецкага чалавека.

Вялікая роля ў ажыццяўленні гэтай задачы належыць фізічнай культуры і спорту як важнейшым элементам усебаковага, гарманічнага развіцця чалавека. Пры гэтым нельга не мецць на ўвазе таксама і вялікага сацыяльнага боку справы: фізічная культура і спорт выступаюць як сродак аздараўлення, падоўжання жыцця і забеспячэння паўнакроўнай і шматграннай дзейнасці савецкіх людзей.

Неацэннае значэнне ў асэнсаванні і практычным ажыццяўленні задач фізічнага выхавання маюць працы заснавальнікаў марксізму. Выкрываючы антынароднасць ка-

піталістычнага грамадства, Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс падкрэслівалі ролю гэтага боку выхавання для аздараўлення і абароны рабочага класа ад пагрозы фізічнай дэградацыі. Яны ўказвалі, што капіталізм нясе ў сабе пагрозу фізічнага выраджэння для маладога пакалення пралетарыяту, бо капіталістычная вытворчасць «узурпіруе час, неабходны для росту, развіцця і здаровага захавання цела».

К. Маркс і Ф. Энгельс вызначылі асноўныя шляхі ўсебаковага развіцця працоўных ва ўмовах сацыялістычнага грамадства. Спалучэнне прадукцыйнай працы з навучаннем і гімнастыкай (інакш: з фізічным выхаваннем), пісалі яны, выступае «не толькі як адзін са сродкаў для павелічэння грамадскай вытворчасці, але і як адзіны сродак для выхавання ўсебакова развітых людзей».

Уладзімір Ільіч Ленін распрацаваў пра-

граму камуністычнага выхавання працоўных, асабліва моладзі, ва ўмовах новага грамадства. Для гэтага неабходна цесная сувязь паміж фізічным і духоўным развіццём чалавека. «Моладзі, — гаварыў У. І. Ленін, — асабліва патрэбны жыццярадаснасць і бадзёрасць. Здаровы спорт — гімнастыка, плаванне, экскурсіі, фізічныя практыкаванні ўсякага роду, — рознабаковасць духоўных інтарэсаў, вучэнне, разбор, даследаванне і ўсё гэта па магчымасці сумесна!»

Ідэі заснавальнікаў марксізму-ленінізму аб ролі і значэнні фізічнай культуры і спорту ў камуністычным выхаванні працоўных знайшлі сваё яркае ўвасабленне ў палітыцы і практычнай дзейнасці нашай партыі.

Ужо ў ліпені 1925 года Цэнтральны Камітэт партыі прыняў спецыяльную па-

юцца адным з важнейшых сродкаў камуністычнага выхавання працоўных. Клопаты партыі аб далейшым развіцці фізкультуры і спорту знайшлі сваё выражэнне і ў пастанове Цэнтральнага Камітэта ад 23 верасня 1929 года, у якой выкладаліся асноўныя мерапрыемствы па арганізацыйнаму ўмацаванню фізкультурнага руху і больш шырокаму ўцягненню ў яго працоўных мас горада і вёскі.

У 1931 — 1934 гадах пад кіраўніцтвам ЦК партыі і пры актыўным удзеле камсамола быў створаны ўсесаюзны фізкультурны комплекс «Гатоў да працы і абароны СССР». Вядома, якую велізарную ролю адыграў ён у падрыхтоўцы таго пакалення савецкіх людзей, якія на фронце і ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны кавалі перамогу над ворагам.

У хуткім часе пасля вайны, 27 снежня 1948 года ЦК ВКП(б) прымае пастанову, у якой зноў указвае на велізарнае значэнне фізічнай культуры ў справе камуністычнага выхавання працоўных. У ёй у якасці галоўных задач ставілася патрабаванне аб развіцці масавага фізкультур-

З поўным тэкстам дакумента магчыма азнаёміцца ў бібліятэцы